


# «ВЫХАД У СВЕТ» ПА-БЕЛАРУСКУ

**ЛІДА. 15 лютага ў краме «Книжный мир» раённага цэнтра адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет». Сустрэчу прымеркавалі да Сусветнага дня роднай мовы. Гасцямі лідскіх літаратараў і аматараў мастацтва сталі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі – навукоўцы, педагогі, літаратурныя крытыкі, паэты.**

У рамках лютаўскага пасяджэння літаратурнай гасцёўні перад лідскімі калегамі і аматарамі мастацкага слова выступілі кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць (ураджэнка Лідскага раёна) і кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнавец, літаратурны крытык, паэт, фальклярыст Руслан Казлоўскі. Калег па традыцыі прадставіў аўдыторыі гродзенскі рэзідэнт літаратунай гасцёўні, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. «Наш пісьменніцкі калектыў можа па праве ганарыцца прысутнасцю ў яго шэрагах аўтарытэтных навукоўцаў-літаратуразнаўцаў. Удзел у грамадска-літаратаруным жыцці спецыялістаў такога высокага ўзроўню мае вялікае практычнае значэнне», – адзначыў Дзмітрый Мікалаевіч у прэамбуле да прэзентацыі творчасці гасцей з Гродна. Пацвярджэннем яго слоў сталі самі выступленні. Гродзенцы прысвяцілі іх надыходзячаму Сусветнаму дню роднай мовы, – сустрэча ў Лідзе



ў межах літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» стала адным з першых тэматычных мерапрыемстваў у Гродзенскім рэгіёне. За дамоўленасць аб гэтым варта падзякаваць аднаму з ініцыятараў праекта, члену Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэту Руслану Піваварару. Між іншым, сама літаратурная гасцёўня пад назвай «Выхад у свет» функцыянуе ў кнігарні «Книжный мир» з 2019 года, калі лідскі паэт і яго жонка Святлана, таксама паэтэса, падзяліліся гэтай ініцыятывай з раённымі ўладамі і атрымалі іх падтрымку. Пасяджэнні адбываюцца тут у трэцюю суботу кожнага месяца. Дадзеная лакацыя з'яўляецца адзінай кропкай на прадпрыемствах гандлю Гродзенскай вобласці, дзе ладзяцца літаратурныя сустрэчы. Апошнія два гады ў праекце актыўна ўдзельнічаюць літаратары з Гродна. Пасля ўступлення Руслана Піваварава ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ўзяты курс на знаёмства ў ходзе лідскіх кніжных сустрэч з калектывам Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. А гэта прадугледжвае наданне праекту большай рэгіянальнай скіраванасці. Тым больш, што рэгіянальны фактар – магістральная ідэя творчай стратэгіі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Удзельнікі лютаўскай сустрэчы не абышлі ўвагай і іншыя тэмы апошняга месяца зімы. А паколькі мерапрыемства супала з датай рэлігійнага праваслаўнага свята Стрэчання, праграму мерапрыемства адкрыў запрошаны госць – настаяцель прыхода храма Усіх Святых горада Ліды протаіерэй Уладзімір Яроміч *(на фота).*



Айцец Уладзімір прысвяціў сваё выступленне зместу свята, яго асветніцкай, аб'яднаўчай сутнасці. «У гэты дзень Святой сустрэчы не толькі зіма сустракаецца з вясной, але і вечнае, боскае наведвае нашу штодзённасць, каб накіраваць нас на шлях ласкі Божай», – падкрэсліў святар. У сваім выступе бацюшка таксама зрабіў спасылку на зборнік духоўна-філасофскай лірыкі Руслана Піваварава «Свой крест», прэзентацыя якога нядаўна адбылася ў Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы. Айцец Уладзімір павіншаваў са Стрэчаннем і падарыў кожнаму з прысутных грамнічную свечку, асвечаную ў лідскім храме Усіх Святых.



Аліна Сабуць *(на фота)* – сапраўдны майстар слова, вядомы на Гродзеншчыне і ў Беларусі. Выступленне ў Лідзе для Аліны Эдмундаўны – вельмі кранальны, хвалюючы момант вяртання да сваіх каранёў, таму што нарадзілася выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы, беларускі вучоны і літаратарка, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь у Лідскім раёне. Пісьменніца распавяла пра свой творчы шлях пазнаёміла аўдыторыю з яго этапамі, найбольш важкімі з якіх стаў выхад кніг «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў» *(Мінск, Выдавецкі цэнтр БДУ, 2022)*; «”Наперад ісці чалавеку гуманнаму…”. Беларуская мастацкая публіцыстыка XX-XXI стагоддзяў» *(Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2023)* і канешне высокія ўзнагароды: Нацыянальная літаратурная прэмія Рэспублікі Беларусь (2023) у намінацыі «Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства» і прэмія Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у той жа намінацыі (2022). У ходзе прэзентацыі кніг прагучалі імёны Максіма Багдановіча, Алеся Адамовіча, Рыгора Барадуліна (з ім пісьменніцу звязвала асабістае знаёмства), Льва Клейнбарта, Янкі Купалы, іншых постацей з айчыннага літаратурнага пантэону і сферы ўвагі даследчыка. Важным напрамкам у дзейнасці літаратурнага крытыка сталі даследаванні творчасці сучасных гродзенскіх літаратараў Людмілы Кебіч, Дануты Бічэль (таксама

ўраджэнкі Лідчыны), Віктара Кудлачова, Ірыны Фамянковай і іншых. У тандэме з Р. К. Казлоўскім пісьменніцай створаны цыкл кніг «Воранаўшчына літаратурная» (выдавецкі напрамак дзейнасці). Прагучалі цытаты з артыкулаў аўтара. Сапраўднай асалодай стала для сяброў літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» гучанне паэзіі Аліны Сабуць, у радках якой педагог, даследчык, грамадскі дзеяч адкрываецца з іншага боку, паўстае ў сентыментальным, рамантычным вобразе, поўным тонкага лірызму і высокіх душэўных памкненняў. Можна не сумнявацца, што спатканне з Алінай Сабуць стала для лідскіх калег па пяры сапраўдным вытокам натхнення і будзе ўспамінацца яшчэ доўгі час.




Руслан Казлоўскі *(на фота)* з тых людзей, пра якіх можна напісаць кнігу, яркую, цікавую, дасціпную. Постаць, вядомая многім у горадзе над Нёманам і гасцям абласнога цэнтра. Справа ў тым, што голасам Руслана Канстанцінавіча аб'яўляюцца прыпынкі ў гродзенскім грамадскім транспарце. Пра гэты бок сваёй грамадскай дзейнасці госць распавёў вельмі змястоўна. Не абышоў увагай наш калега па СПБ і сваю навуковую дзейнасць, пазнаёміў з яе асноўнымі напрамкамі, выданнямі і публікацыямі. Асаблівую цікавасць выклікала прэзентацыя кнігі «Через тернии» (з кніжнай серыі «Зоркі Гродзенскага спорту»; *«ЮрСаПринт», Гродна, 2022*) пра трагічны і гераічны лёс спартсмена-інваліда, паралімпійскага чэмпіёна з Гродна Аляксандра Трыпуця. Гэтая праца па праве дадае ў багаж літаратара яшчэ адно амплуа – публіцыста. Трэба было бачыць, з якім захапленнем пра падрыхтоўку кнігі, з якой любоўю да яе героя распавядаў аўтар. Слухачы выказаліся пра неабходнасць знаходжання кнігі Руслана Казлоўскага «Через тернии» ў школьных бібліятэках і яе вывучэння ў школьнай праграме. Яшчэ Руслан Канстанцінавіч – вядомы як фалькларыст. Разам з Алінай Эдмундаўнай Сабуць і іх студэнтамі кожнае лета ўжо на працягу многіх гадоў ён удзельнічае ў шматдзённых фальклорных экспедыцыях, і гэта надзвычай цікава, можна не

сумнявацца. Вучоны сур’ёзна захоплены тэматыкай беларускай міфалогіі, славянскімі вераваннямі, старажытнай культурай язычніцкага перыяду. Гэтаму напрамку дзейнасці члена СПБ прысвечаны яго аўтарскі анлайн-праект «Відавочнае аб патаемным» на сайце Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Больш за тое, пісьменнік-фалькларыст піша фальклорныя вершы, вершы-замовы (іх прыклады былі прадстаўлены аўдыторыі). У фінале прэзентацыі творчасці Руслан Казлоўскі выступіў і як празаік – прачытаў свае празаічныя мініяцюры з цыклу «Пляж», якія выклікалі вясёлыя ўсмешкі на тварах людзей, а сам пісьменнік – шчырую сімпатыю.

Візітнай карткай творчасці Аліны Сабуць і Руслана Казлоўскага з’яўляецца яе цесная сувязь з народнымі традыцыямі, а таксама з грамадскай дзейнасцю (і членства ў шэрагах Саюза пісьменнікаў Беларусі – толькі частка гэтай дзейнасці, хоць і вельмі значная). Такая выснова напрошваецца пасля прэзентацый творчасці гасцей з Гродна ў лютаўскай літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет». Праграму мерапрыемства працягнулі лідскія літаратары, члены Лідскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Чертог поэта» і Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце»: Уладзімір Глінін (паэт, кіраўнік раённага літаб’яднання); Алесь Хітрун (краязнавец, навуковы супрацоўнік Лідскага гістарычна-мастацкага музея); паэты Валерый Мацулевіч; Людміла Русь; Ала Юшко; Ганна Рэлікоўская; Канстанцін Якубчык; Людміла Краснадубская; Тэрэза Смольская; Таццяна Сямёнава. Паэт Уладзімір Глінін падзяліўся думкамі наконт нядаўняй прэзентацыі зборніка духоўна-філасофскай лірыкі Руслана Піваварава «Свой крест», а таксама прысвяціў сваю дэкламацыю аднаго з твораў Барыса Пастэрнака нядаўняму 135-годдзю з дня нараджэння паэта. Алесь Хітрун акунуўся ў кранальныя ўспаміны пра сваё студэнцтва і адрасаваў словы шчырай любові сваім універсітэцкім выкладчыкам Аліне Эдмундаўне і Руслану Канстанцінавічу. Зайшла гутарка і пра набліжэнне Дня беларускага пісьменства, пра адкрыццё ў Лідзе помніка Валянціну Таўлаю…

Як заўсёды, атмасфера падчас сустрэч у лідскай літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» панавала вельмі цёплая. Атмасфера адзінай дружнай сям’і землякоў, паплечнікаў, аднадумцаў; гармонія творчай думкі і шчырага пачуцця, здаецца, такіх розных людзей, дэмакратычнае ўспрыманне адзін аднаго такімі, якія мы ёсць. А інакш і быць не можа. Таму што адзінства, узаемапаразуменне, чалавечнасць – усё гэта па-саюзнаму. Дабрыня, спагадлівасць, шчырасць – гэта па-беларуску.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** лютаўскі «Выхад у свет» з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі Аліны Сабуць і Руслана Казлоўскага. Ліда, кнігарня «Книжный мир», 15 лютага 2025 года.




Адзін з ініцыятараў праекта, вядучы мерапрыемства Руслан Піваварaў: чарговае пасяджэнне літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» аб’яўляецца адкрытым




Выступае Айцец Уладзімір




Гасцей з Гродна па традыцыі прадставіў Дзмітрый Радзівончык





Выступае кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць (ураджэнка Лідскага раёна)










Выступае кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнавец, літаратурны крытык, паэт, фальклярыст, публіцыст Руслан Казлоўскі


Через тернии...


проза
Через тернии...


замежна
На Неманскай хвалі
Літаратурны альманах
Праз прызму часу




Кветкі замест тысячы слоў




ХРЕСТОМАТИЯ
Самый лучший
Великий мост


РЕПИН
СТРУГАЦКИЕ
ТОЛСТОЙ
ЧЕХОВ




Уладзімір Глінін




Алесь Хітрун



Валерый Мацулевіч




Людміла Русь



Ала Юшко



Ганна Рэлікоўская




Канстанцін Якубчык




Людміла Краснадубская







Тэрэза Смольская



Таццяна Сямёнава






Госці з Гродна з лідскай паэтэсай Святланай Піваваравай



Лідскія і гродзенскія творцы разам


Пасля мерапрыемства





Гродзенцы з лідскімі калегамі Святланай і Русланам Півавараvымі




**Фота** Руслана і Святланы Піваваравых